Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

12 ВЕРАСНЯ 2020 г. СУБОТА

№ 178 (29292)

ЗВЯЗДА

ХРАМ, ЯКІ ПЕРАЖЫЎ ВАЙНУ І САВЕЦКУЮ ЭПОХУ 3

СЯРГЕЙ КАВАЛЬЧЫК ПРА НОВЫ ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН 6

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У нашай краіны няма іншага выйсця, як рабіць стаўку на інтэлект»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас наведвання 11 верасня Нацыянальнай акадэміі навук

Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з выстаўкай навуковых і навукова-тэхнічных дасягненняў, паведамляе яго прэс-служба.

Фота БелТА.

Пасля азнаямлення з навуковымі распрацоўкамі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з беларускімі навукоўцамі — прадстаўнікамі НАН, вышэйшых навучальных устаноў, галін народнай гаспадаркі. «Я памятаю гэты маленькі перыяд, калі мне давялося займацца навуковай дзейнасцю, і да гэтага часу скіляюся перад вучонымі, якія пражылі сваё жыццё ў навуцы. Гэта вялікія людзі, таму што складанейшай і цяжэйшай працы няма, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Накіроўваючыся да вас, я разумеў, што навукоўцы ў нас (як бы банальна гэта ні гучала) — гэта не проста разумнейшыя людзі, якія глядзяць на ўсе падзеі, што адбываюцца, з вышыні сваіх глыбінных ведаў. Гэта людзі, якія валодаюць жыццёвай мудрасцю, якія шчыра любяць радзіму, таму што жывуць у служэнні навуцы і народу».

ПРА ЗМЯШЭННЕ НАВУКІ І ПАЛІТЫКІ

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што ў краіне ні адно важнае рашэнне не прымаецца без удзелу прадстаўнікоў навуковай сферы. «Мяняўся таму я рэгулярна сустракаюся з навуковай супольнасцю і заўсёды раюся з навукоўцамі. Усе мы ведаем, што развіццё навукі вызначае будучыню. Прычым будучыня не толькі асобнай дзяржавы, але і ўсяго чалавецтва», — звярнуў увагу Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы дадаў, што пра гэта не стамляўся гаварыць і знакаміты беларус — лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіцы Жарэс Алфёраў, дзякуючы адкрыццям якога планета ступіла ў лічбавую эру. «Мы з гэтым чалавекам вельмі шмат размаўлялі, часта спрачаліся. Але мяне заўсёды захапляла, што ён — сусветнае свяціла — усё жыццё заставаўся найвялікшым патрыётам нашай Беларусі і сваю любоў да яе даказваў і словам, і справай, не дазваляючы нікому нават намёку благога ў наш бок. Але ж былі і іншыя прыклады, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — На світанку нашай незалежнасці сустракаліся людзі, якія спрабавалі перацягнуць навукоўцаў на слізкую дарогу брудных палітычных гульняў. Я вельмі цаню, што вы выстаялі ў той складаны пераломны момант, засталіся верныя свайму сумленню і пакліканню».

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, і сёння беларускія навукоўцы трымаюць удар, не паддаюцца на правакацыі палітыканаў, захоўваюць закладзеныя больш за 90 гадоў таму традыцыі і перадаюць іх моладзі.

СТАР. 2

Урок на грыбную тэму



Сямігадовы мінчанін Арсеній МЯСНІКОЎ змалку прывучаны збіраць грыбы і ягады, таму заўсёды просіцца з бацькамі ў лес, калі там з'яўляюцца лісічкі, баравікі, падасінавікі ды падбярозавікі. Лецішча бацькоў знаходзіцца паблізу ўшацка-докшыцкай мяжы, дзе шмат лясоў і багатых на грыбы мясцін. Менавіта там — у прыгожай і водарнай баравіне — я і сфатаграфаваў вясёлага хлопчыка-грыбніка.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег МАКАРАЎ, дырэктар Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў:

«Тая турбулентнасць, якая цяпер адбываецца ў Беларусі, — гэта часовая сітуацыя, якая ніяк не адлюстроўваецца ні на геаграфічным становішчы, ні на транзітных магчымасцях, ні на экспарце Беларусі, ні на яе адносінах са сваімі асноўнымі партнёрамі. Больш за тое, на сённяшні дзень мы знаходзімся перад новымі магчымасцямі, якія неабходна выкарыстоўваць. Яны звязаны з выхадам свету з пандэміі. Мы лічым, што глабальна свет не адразу можа выйсці на тыя межы, якія былі ў яго да COVID-19, але рэгіянальна, у рамках еўразійства, мы маглі б рабіць сапраўды новыя, вялікія крокі».

КЛУБ «ЗАЛАТЫЯ РУКІ»

Каму скорыцца прафесійны Алімп?

Фінал IV Рэспубліканскага конкурсу прафесійнага майстэрства WorldSkills Belarus 2020 пройдзе 15—18 верасня.

Ён будзе арганізаваны па стандартах міжнароднага руху WorldSkills International і аб'яднае спаборніцтвы сярод маладых рабочых, спецыялістаў, навучэнцаў устаноў прафесійнай адукацыі і студэнтаў ВНУ па прафесійных кампетэнцыях у сферы вытворчых, інфармацыйных, будаўнічых, транспартных тэхналогій, сацыяльных і персанальных паслуг, моды і дызайну.

Праграма рэспубліканскага конкурсу ўключае спаборніцтвы па 38 конкурсных кампетэнцыях WorldSkills, сярод іх «малярныя і дэкаратыўныя работы», «сталярная справа», «вытворчасць мэблі», «геадэзія», «інжынерны дызайн CAD», «мехатроніка», «зварачныя работы», «электроніка», «мабільная робататэхніка», «тэхналогія моды», «візуальны мерчандайзінг», «фларыстыка», «транспарт і лагістыка», «кузаўны рамонт», «аўтамабільныя тэхналогіі», «эксплуатацыя сельскагаспадарчых машын», «цырульніцкае майстэрства», «прыкладная эстэтыка», «кулінарнае мастацтва», «рэстаранны сэрвіс», «хлебапячэнне», «вэб-дызайн і распрацоўка», «сеткавае і сістэмнае адміністраванне» і іншыя.

СТАР. 3

Фота з сайта worldskills.by

Вёскі, якія знікаюць: апошнія жыхары

Пузі Бярозаўскага раёна

МЕСЦА СІЛЫ ДВУХ ДЭПУТАТАЎ

Вёска з такой крыху дзіўнай назвай схавалася паміж балот і лясоў побач са Спораўскім запаведнікам. Населены пункт, дзе пражывае каля дваццаці чалавек, раскіданы ў прасторы не на адзін кіламетр. Праязджаеш некалькі хат пасля першага ўказальніка, а потым — кіламетр лесу і поля, потым зноў вуліца. Такое рассяленне прадыктавана балоцістай мясцовасцю: дзе быў сухі лапік зямлі, там і ставілі хаты. Пазней прайшла меліярацыя, і балоты адышлі ад вёскі. Цяпер пра тых, хто жыве далей ад цэнтра, кажуць: на хутарах. На такім вось «хутары» жыве адна з сённяшніх гераінь — 93-гадовая Соф'я МІКІЦІЧ.

Партызанскі край

Соф'я Уладзіміраўна як старэйшая жыхарка прыгадала гады вайны, як хаваліся ад адпраўкі ў Германію, як лютавалі немцы, бо вакол у лясах былі партызаны.

— Страшна было, дзеткі, — успамінае Соф'я Уладзіміраўна, — кожную ноч баяліся, што могуць прыйсці, забіць, забраць усю маёмасць. Так і было аднойчы. Калі сталі маладых забіраць у тую Нямеччыну, нас з сястрой, мы былі старэйшыя, бацькі адправілі да свякрухі ў Здзітава, бо там немцаў не было. Аднойчы была нейкая аблава, шукалі партызанаў. Бацькі так расказвалі, прыйшлі на досвітку, сталі выганяць усіх з хаты: яны, мусіць, баяліся выходзіць, малыя плакалі, бо ў вокны глядзелі людзі са зброяй, да таго ж стаялі крыкі, лямант, сабакі брахалі. Тады сталі страляць угару, нехта з іх, каб настрашыць больш, кінуў гранату ў акно кухні. Добра, што яна ўзарвалася ў карыце, дзе бульбу свінням таўклі, і вялікай шкоды не нарабіла. Ну бацька і рашыўся выйсці, выстраіў малых каля плота.

СТАР. 3

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай і Індыя дамовіліся аб урэгуляванні на мяжы

Міністр замежных спраў Кітая Ван І і яго індыйскі калега Субраманьям Джайшанкар на сустрэчы ў Маскве дамовіліся аб нармалізацыі сітуацыі на мяжы паміж дзвюма краінамі ў Ладакху. «Міністры замежных спраў пагадзіліся з тым, што абодва бакі павінны прытрымлівацца шэрагу важных дамоўленасцяў, дасягнутых лідарамі дзвюх краін у дачыненні да развіцця індыйскіх адносін, у тым ліку не дапусціць, каб рознагалоссі перараслі ў канфлікт», — адзначаецца ў сумеснай заяве бакоў па выніках сустрэчы. Міністры дамовіліся падтрымліваць сувязь і працягваць кансультацыі па кітайска-індыйскіх памежных пытаннях. Сітуацыя на лініі фактычнага кантролю ў Ладакху абвастрылася ў маі, калі, паводле сцвярджэння Дэлі, у сутыкненні паміж памежнікамі дзвюх краін загінулі 20 індыйскіх вайскоўцаў. Індыя таксама абвінавачвала ваенных КНР у правакацыях у канцы жніўня. Кітай гэтыя паведамленні абвяргае, заяўляючы, што лінію кантролю перасякаюць індыйскія войскі.

У Ліване стварылі камісію па наладжванні работы бейруцкага порта

Па прапанове прэзідэнта рэспублікі Мішэля Ауна яе ўзначаліць выконваючы абавязкі міністра грамадскіх работ і транспарту Мішэль Наджар. «Мэтай камісіі стане арганізацыя на новай аснове ўсёй дзейнасці порта і забеспячэнне бяспекі на яго тэрыторыі», — адзначаецца ў рашэнні Вышэйшага савета абароны, з якім азнаёміў журналістаў генерал Махмуд аль-Асмар. Паводле яго слоў, Аун заклікаў сілавікоў прыняць усе меры для таго, каб больш не дапусціць у гавані ніякіх здарэнняў, якія ставяць пад пагрозу жыццё грамадзян. «ВСА пастанавіў правесці рэвізію ўсіх складскіх памяшканняў у марскім порце, а таксама ў міжнародным аэрапорце Бейрута, і пазбавіцца ад матэрыялаў, якія могуць прадстаўляць небяспеку для жыцця людзей», — адзначыў генерал. Як вядома, 10 верасня на тэрыторыі порта Бейрута, побач з месцам, дзе адбыўся выбух 4 жніўня, успыхнуў новы буйны пажар. Спачатку загарэліся склады Міжнароднага камітэта Чырвонага Крыжа, дзе захоўваліся харчовыя наборы і запасы алею. Адтуль агонь перакінуўся на суседнія памяшканні, дзе знаходзіліся шыны і гаруча-змазачныя матэрыялы.

Папуляцыі жывёл у свеце скараціліся на 68 працэнтаў

Папуляцыі млекакормячых, птушак, рэптылій, рыб за апошнія 50 гадоў скараціліся на 68 %. Такая сумная тэндэнцыя вынікае з дакладу Сусветнага фонду дзікай прыроды (WWF), прысвечанага разліку глабальнага індэкса жывой планеты 2020 года. Такі паказчык заснаваны на даных аб колькасці больш чым чатырох тысяч відаў млекакормячых, птушак, рэптылій і рыб. Пры гэтым навукоўцы аналізавалі звесткі пра папуляцыі пазваночных жывёл (амаль 21 тысяча), паколькі яны прасцей паддаюцца ўліку. Найбольшыя страты, згодна з дакладам, зафіксаваныя ў трапічных субрэгіёнах Паўночнай і Паўднёвай Амерыкі, — там скарачэнне ацэньваецца ў 94 працэнты. Як вядома, індэкс жывой планеты паказвае стан сусветнай разнастайнасці і разлічваецца на аснове сабраных дадзеных аб папуляцыях пазваночных відаў і ўсярэдненай дынамікі іх колькасці. Ён фарміруецца кожныя два гады, пачынаючы з 1998-га.

КАРОТКА

- **Падоўжаныя тэрміны выплаты імянных стыпендый Прэзідэнта ў галіне фізкультуры і спорту.**
- Прадстаўнік дзяржаўнага рэгістратара Ватыкана наведвае Беларусь 11—14 верасня.
- **Беларускія банкі накіравалі ў І паўгоддзі каля Br19,2 млн на аказанне дабрачыннай дапамогі.**
- Брэсцкі аўтапарк адначуляе рэйсы ў Вільнюс.
- **Санэпідслужбы выявілі парушэнні ў 27 % праверэных школьных кафэ і сталовых.**
- Мінтрансы Беларусі і Расіі абмеркавалі павелічэнне перавозак беларускіх грузаў праз парты Расіі.

Гасцёўня

Моцныя мары Таццяны Дамашынай

Таццяна ДАМАШЫНА — прыгожая, невысокая, нават мініяцюрная. Але гэта толькі на першы погляд: не кожная зможа падымаць 140-кілаграмовыя штангі. Дзяўчына з аграгарадка Гарадзішча, што ў Баранавіцкім раёне, за некалькі гадоў стала чэмпіёнкай свету, Еўропы, устанавіла шмат гучных рэкордаў. Сёння яе мэта — папаўненне медальнай калекцыі, а таксама папулярызацыя спорту і здаровага ладу жыцця ў Беларусі.

— Таня, а што такое паўэрліфтынг?

— Гэта сілавое трохбор'е. Нашы асноўныя практыкаванні — прысяданне са штангай, жым штангі лежачы і станавая цяга, дзе трэба падняць максімальную для сябе вагу і выпрастацца. Чым большая вага — тым лепшы вынік.

СТАР. 8

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

«У нашай краіны няма іншага выйсця, як рабіць стаўку на інтэлект»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Акадэмія навук БССР з навукоымі інстытутамі, школамі і кірункамі стваралася пад канкрэтныя задачы і галіны велізарнай імперыі — Савецкага Саюза. Мінск нярэдка станавіўся піянерам для ўвасаблення ў жыццё многіх прагрэсіўных ідэй. Але... распад Саюза прынёс імгненны разрыў навуковых і народна-гаспадарчых сувязяў, што паставіла многія НДІ на мяжу выжывання, — сказаў Прэзідэнт. ...Я добра памятаю, як казалі пра тое, ці патрэбна невялікай незалежнай краіне свая Акадэмія навук. Ці, можа, прасцей усё разбурыць дашчэнту, распрадаць напрацоўкі, будынкі, фонды — прэзідэнтаў было шмат. А затым, калі разбагацеем, купляць патрэбныя тэхналогіі і тавары за межамі краіны», — успомніў кіраўнік дзяржавы.

ТЭОРЫЯ І ПРАКТЫКА

Аднак у краіне ўсё ж вырашылі адрадзіць навуковую галіну, у далейшым прыйшлі яшчэ да адной высновы — неабходна ствараць сувязь паміж вытворчасцю і навукай.

Сёння даследаванні і распрацоўкі ў краіне выконваюць 460 арганізацый, у іх працуюць 28 тысяч чалавек, адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Толькі Нацыянальная акадэмія навук узаемадзейнічае з вучонымі з 93 дзяржаў, на яе базе дзейнічаюць 42 міжнародныя даследчыя цэнтры. «Гэта была вельмі жорсткая лінія з майго боку і маё патрабаванне да кіраўніцтва Акадэміі навук. Вы, напэўна, заўважылі: любая мая паездка за межы краіны — побач са мной вучоны, — дадаў Прэзідэнт. — Такім чынам, ***навука зарабляла для краіны, для вытворчасці, і зараблялі самі вучоныя. Гэты шлях будзе адным з прыярытэтаў у будучай пяцігодцы».***

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што сапраўдная навука павінна перш за ўсё служыць людзям, паляпшаць якасць іх жыцця. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што дзякуючы навукоўцам Беларусь на сусветнай арэне ведаюць як краіну, дзе робяць самыя вялікія самазвалы і здабываюць калійную руду, выраблялюць лазеры і оптаэлектроніку, мікрасхемы і электрычны транспарт, пасканарыміі тэмпамі развіваюць сферу інфармацыйных тэхналогій, выконваюць высокатэхналагічныя хірургічныя ўмяшанні, выпускаюць сучасныя лекавыя прэпараты. У Беларусі таксама асвойваецца энергія мірнага атама, вучоныя краіны стварылі ўласную даследчую станцыю ў Антарктыдзе, удзельнічаюць у рабоце на Вялікім адронным калайдары. Рэспубліка нароўні з буйнымі краінамі ўвайшла ў лік касмічных дзяржаў, што два гады таму дазволіла правесці ў Мінску Міжнародны кангрэс Асацыяцыі ўдзельнікаў касмічных палётаў.

«Усе гэтыя дасягненні красамоўна сведчаць пра тое, што ***абраная дзяржавай стратэгія комплекснай сістэмнай падтрымкі навукі была правільная. Так будзе і далей,*** — заявіў кіраўнік дзяржавы. — Любую навінку неабходна як мага хутчэй патэнтаваць і ўкараняць. Вытворчасці не змогуць быць паспяховымі, калі ўжо сёння не будуць на крок наперадзе канкурэнтаў. І ў гэтай навукова-прамысловай гонцы менавіта вучоны — галоўны саюзнік вытворцы. У нашай краіны — не самай багатай на прыродныя рэсурсы — няма іншага выйсця, як рабіць стаўку на інтэлект».

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што Беларусь сёння адносіцца да ліку краін з высокім узроўнем навуковага патэнцыялу. А ў рэйтынгу добрых краін (Good Country Index) рэспубліка займае 54-е месца сярод 153 дзяржаў. «Больш за трэць нашага экспарту складае навукаёмістая і высокатэхналагічная прадукцыя. Летась сваім інтэлектам мы зарабілі амаль $15 млрд. Калі б мы да гэтых яркіх інавацыйных распрацовак дадалі трошкі якасці ў вытворчасці (не толькі ў прамысловасці, гэта і сельскай гаспадаркі датычыцца), мы б не проста павысілі сваю канкурэнтаздольнасць на рынках — мы б былі лідарамі», — пераканаты Прэзідэнт.

ПРЫЦЯГНУЦЬ МАЛАДЫХ

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што адна з галоўных задач беларускай навукі — забяспечыць пераемнасць. «Нам трэба разумна і прагматычна ацэньваць уласныя перспектывы. ***Задача нумар адзін — забяспечыць пераемнасць.*** Не будзе пераемнасці, будзем па-бандыцку ламаць, а потым зноўку будаваць — гэта проста глупства, гэта немагчыма. У нас няма на гэта фінансавых рэсурсаў, каб зламаць дашчэнту, а потым зноў пачынаць будаваць. Таму давайце разам падумаем, як зрабіць навуковы шлях для нашых маладых людзей больш прывабным», — прапанаваў Аляксандр Лукашэнка.

Не менш, чым фінансавае стымуляванне, важны інстытут настаўніцтва, лічыць кіраўнік дзяржавы. «Я заўсёды казаў вучоным: вы толькі тады станеце вялікімі, калі пасля сябе пакінеце дзясятак такіх, як вы, якія працягнуць тое, што вы пачалі», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што многія краіны, арыентаваныя на тэхналагічнае лідарства, маюць навучаных спецыялістаў, якія шукаюць на міжнародных алімпіядах і спаборніцтвах таленавітых юных матэматыкаў, хімікаў, праграмістаў і перамаможаць іх да сябе. Паводдле яго слоў, калі малады чалавек з'ездзіў, павучыўся і вярнуўся ў родную Беларусь кваліфікаваным спецыялістам, які валодае найноўшымі ведамі і тэхналогіямі, — гэта будзе вітацца.

Сярод іншых задач — развіццё навуковаді і інавацыйнай дзейнасці ў рэгіёнах. ***«У абласных і раённых гарадах трэба ствараць больш умоў для працы навукоўцаў»,*** — лічыць Прэзідэнт.

Беларускі лідар заявіў, што чакае ад навуковай сферы стварэння і прасоўвання новых пунктаў росту для ўсёй эканомікі. Паводле яго слоў, дзяржаўныя рэсурсы будуць сканцэнтраваны на развіцці найбольш важных і значных кірункаў навукі, эканомікі і сацыяльнай сферы.

НАПРЭДАДНІ НАРОДНАГА СХОДУ

Аляксандр Лукашэнка разлічвае, што прапановы навукоўцаў стануць падмуркам чарговай пяцігадовай праграмы развіцця краіны. «Мая сустрэча мяне навіта ў гэты перыяд з вамі перш за ўсё тлумачыцца тым, што ***мы напярэдадні***

Юлія Бегіна

вельмі важнага мерапрыемства (Усебеларускага народнага сходу), якое вызначыць лёс краіны на наступную пяцігодку. Я вельмі хачу, каб вы не проста падключыліся да распрацоўкі новай пяцігадовай праграмы і прагназавалі, што будзе ў краіне праз 5 гадоў. Я хацеў бы, каб прапановы нашых навукоўцаў сталі падмуркам гэтай праграмы. Каб яна была рэальнай і выканальнай. Гэта галоўнае, чаму ў гэты перыяд я ў сценах нашай Акадэміі навук», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што ў навуковым асяроддзі заўсёды было шмат іншадумцаў, і ён сам гэта вітаў. «Але тым не менш абсалютна перакананы, маю адпаведныя факты, што большасць нашых навукоўцаў — гэта разумныя, таленавітыя, здольныя людзі. Здольныя ацаніць сітуацыю і зрабіць правільныя высновы. Але гэтага мала. Здольныя паўплываць на іншых. Я перакананы, што такіх у нас большасць», — падкрэсліў Беларускі лідар.

Удзельнікі сустрэчы пацікавіліся, якія важныя задачы стаяць перад дзяржаўнай эканомікай у будучыні. «Эканамічная бяспека — гэта галоўная задача эканомікі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Я думаю, усім зразумелыя асноўныя кірункі развіцця нашай эканомікі, не хачу засяроджвацца на гэтай дыскусіі, яна будзе насіць, хутчэй, практычны характар, чым тэарэтычны. Хоць да месца сёння гаварыць аб эканамічнай тэорыі. Але гэтае пытанне я хацеў бы перавесці ў плоскасць рэформаў, — прадоўжыў Прэзідэнт. — Чаму рэформай? Таму што ўсе альтэрнатыўшчыкі зусім нядаўна крычалі — рэформы, рэформы... Праўда, адзін палітолаг напісаў: усе крычаць пра рэформы, а якія рэформы? Ніхто не можа напісаць, якія. Скажу вам, што пры цяперашняй уладзе, вядома ж, мы будзем ісці сваім шляхам, як ішлі чвэрць стагоддзя, і рэфармаваць нашу эканоміку».

«Успомніце, што было чвэрць стагоддзя таму, і што мы маем цяпер, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Я тады яшчэ прапаноўваў — давайце не будзем нічога ламаць, бо мы стаім на плячах гігантаў. І трэба развіваць тое, што ёсць. У нас ёсць МАЗ, БелАЗ, сельская гаспадарка, якая развіваецца»... «Нічога не трэба ламаць, а трэба развіваць тое, што маем». Пры гэтым ён заўважыў, што былых старшынь а таксама дзяржаўных буйных беларускіх машынабудаўнічых прадпрыемстваў.

МАКСІМАЛЬНА ЗАДЗЕЙНІЧАЦЬ ЭЛЕКТРЫЧНУЮ ЭНЕРГІЮ

У ходзе размовы з вучонымі кіраўнік дзяржавы пазітыўна ацаніў намаганні беларускіх распрацоўшчыкаў у плане развіцця электратэхнікі, за якой будучыня на планеце.

Прэзідэнт адзначыў, што чакае ад беларускіх вучоных сучасных, інавацыйных прапаноў па дадатковым выкарыстанні электрычнасці, якая неўзабаве будзе выпрацоўвацца ад Беларускай атамнай электрастанцыі. «Атамная электрастанцыя — гэта праўда, частка нашай незалежнасці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён звярнуў увагу: у краіне паслядоўна нарошчваецца спажыванне электраэнергіі як для бытавых патрэб, так і для галін народнай гаспадаркі. Для гэтага прымаюцца і стымуляцыйныя меры. ***«Усюды будзем рабіць ухіл на электрычнасць»,*** — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы нам падкажаце тое, што мы, можа быць, не бачым — дзе можна гэтую энергію выкарыстоўваць, — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да ўдзельнікаў сустрэчы. — Трэба смялей ісці. Прапаноўвайце рашэнні. Рашэнні на будучыню, якія забяспечаць наш суверэнітэт і незалежнасць. У нас сапраўды бліскучыя навукоўцы, якія могуць цуды тварыць».

Аляксандр Лукашэнка таксама падкрэсліў правільнасць прынятага ў свой час рашэння аб ўзвядзенні АЭС у Беларусі. «Нягледзя тады мне было прымаць гэтае рашэнне па будаўніцтве атамнай станцыі, у аздзіночку ішоў. Сёння шмат хто ўжо згодныя: правільна, што мы пабудавалі гэтую сучасную станцыю. Будзем выкарыстоўваць яе па ўсіх кірунках», — сказаў ён.

«Займаюцца сваімі адкрыццямі і вынаходствамі нам трэба. Дзякуючы гэтаму мы асвойваем і энергію мірнага атама на нашай першай атамнай электрастанцыі. Гэта адна з прычын ціску на нас. У Польшчы можна планаваць (новую станцыю ім амерыканцы пабудуюць), а нам нельга. Фінляндыі можна будаваць атамныя рэактары, а нам нельга», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама заўважыў, што атамныя станцыі працуюць і вакол Беларусі (па некалькі аб'ектаў у Расіі і Украіне), аднак, нягледзячы на гэта, на краіну ўсё роўна ажыццяўляецца ціск у пытанні будаўніцтва сваёй АЭС. «Без мяне ці са мной вы зразумееце, што такое атамная станцыя. Гэта не толькі вялікае дасягненне і танная энергія. Гэта найвялікшая бяспека для нашай краіны», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на важнасць гуманітарнай бяспекі дзяржавы. «Не ўсё ў нашым жыцці вымяраецца грашыма. Хачу звярнуць вашу ўвагу на тое, што сярод навуковых прыярытэтаў выдзелена гарантаванае бяспекі дзяржавы, у тым ліку гуманітарнай», — сказаў беларускі лідар.

Ён падкрэсліў: прадстаўнікі навуковай сферы — мозг нацыі. «Памятайце, што ***навукоўцы-гуманітарыі сваімі даследаваннямі і напрацоўкамі павінны кансалідаваць беларускае грамадства.*** Кожны з нас павінен усведамляць, якой працай беларускі народ атрымаў свабоду дзяржаўнасць і права самому вырашаць лёс. Нельга гэта страціць, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Хто мы? Адкуль? Куды ідзём? Адказы на гэтыя пытанні нашы дзеці павінны атрымліваць не толькі ад дзядоў — ад нас павінны атрымліваць, ад старэйшых, нашых навукоўцаў, выкладчыкаў, настаўнікаў. Праблем там вышэй за дах».

Прэзідэнт звярнуў увагу: грамадазнаўчыя дысцыпліны павінны выключыць нават гіпатэтычную магчымасць падвойных стандартаў пры ацэнцы гістарычных падзей, паставіць трывалы заслон падтасоўцы або скажэнню тых фактаў, на якіх грунтуюцца традыцыйныя каштоўнасці.

«Ніхто, акрамя нас, не зацікаўлены ў тым, каб мы былі моцнай суверэннай і незалежнай краінай. Краінай, дзе паважаюць мінулае, цэняць сучаснасць і ўпэўненыя ў будучыні, таму што абапіраюцца на патрыятызм і айчынныя навуковыя школы», — рэзюмаваў ён.

Парламенцкі дзённік

«БЕСЦЫРЫМОННАЯ І НЯЗГРАБНАЯ СПРОБА ЎМЯШАЛЬНІЦТВА ВА ЎНУТРАНЫЯ СПРАВЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ»

Так падчас брыфінгу ў парламенце старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Андрэй САВІНЫХ назваў рэзалюцыю Сейма Літвы аб прызнанні Святланы Ціханоўскай выбраным лідарам Беларусі.

«Яна (рэзалюцыя. — **«Зв.»**) сведчыць аб недарэчнасці намаганняў літоўскага боку ў жаданні надаць дадатковую вагу і значнасць сваёй палітычнай пазіцыі», — заявіў дэпутат.

Па словах Андрэя Савіных, літоўскія дэпутаты, якія прагаласавалі за гэта рашэнне, прадэманстравалі «поўнае грэбаванне стандартамі добрасуседства, здаровага сэнсу і элементарнай парламенцкай этыкі».

«Іх дзеянні ставяць пад сумненне і дыскрэдытуюць усе прапановы аб знешнім пасрэдніцтве, паказваючы рэальны, а не дэкларатыўны сэнс», — дадаў Андрэй Савіных.

Марыя ДАДАЛКА.

Меркаванне

Павел САПОЦЬКА:

«КАНСАЛІДАЦЫЯ ГРАМАДСТВА — ГЭТА ПРАЦА...»

Наша размова з дырэктарам Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі Паўлам САПОЦЬКАМ адбылася адразу пасля вялікай музейнай планёркі. З яе ж і пачалася размова.

— Павел Міхайлавіч, што вырашалі?

— Пытанняў зараз набіраецца гэтулькі, што часам ловіш сябе на думцы: адно толькі прагаворванне іх зойме процьму часу. Ва ўмовах, якія стварыў для ўсіх нас COVID-19, шмат што з традыцыйнай арганізацыі працы засталося збоку. І нарады, пасяджэнні ў большасці сваёй — таксама. Адпаведна, многія звычайныя тэмы расцягнуліся на пэўны час. А жыццё патрабуе ўсё большай руплівасці. Сёння, пагадзіцеся, як ніколі патрэбны хуткасці, сёння нельга стаяць на месцы і не спрабаваць зазірнуць у будучыню. І мяне часам здзіўляе, калі адбываецца падмена паняццяў, і творчая інтэлігенцыя губляе сябе ў справах, якія не павінны быць ёй уласцівы, якія не фарміруюць памкненні грамадства да стваральнай працы, да кансалідацыі інтарэсаў.

— У вас досыць вялікі калектыў...

— Нацыянальны гістарычны музей — гэта яшчэ і шэраг філіялаў, кожны з якіх з'яўляецца адлюстраваннем таго ці іншага кірунку ў гісторыка-асветніцкай працы. Усе пяць філіялаў таксама працуюць на пашырэнне ўяўленняў нашага грамадства пра гісторыю, культуру Айчыны. І сёння, калі і колькасць наведвальнікаў іншая — нашмат меншая, чым у ранейшыя гады, калі многа ў каго крыніцамі асветы становяцца вуліца, мітынгі і пустаслоўе, нам трэба шукаць новыя формы ўзаемадзеяння з рознымі сацыяльнымі групамі.

— І ў чым гэта выяўляецца?

— Стараемся інтэнсіфікаваць працу над рознымі новымі экспазіцыямі, выстаўкамі. Нацыянальны гістарычны музей даўно і досыць прафесійна паказвае рэтраспектыву беларускай культуры, беларускага мастацтва. Не абмінулі мы і 100-годдзе Купалаўскага тэатра. Заходзьце на гэтую гісторыка-тэатральную выстаўку, спасцігайце — і вы адкрыеце шмат цікавага, пазнаёміцеся са многімі постацямі беларускага тэатра. Пачала работу выстаўка «Геалагасцыя Мінск. Графіка XX ст.», прымеркаваная да Дня горада. На ёй прадстаўлена каля 30 жывапісных і графічных работ са збору Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, сярод якіх можна ўбачыць знаёмыя лакацыі, плошчы і вуліцы беларускай сталіцы. Гэта своеасаблівая рэтраспектыва апошніх 200 гадоў існавання Мінска, дзе кожны перыяд адметны сваімі асаблівасцямі, знакавымі для гараджан падзеямі.

— У музеі багатыя калекцыі нумізматыкі, прадметаў мастацтва...

— І мы думаем, актыўна працуем над тым, каб як мага шырэй распавесці пра гэта не толькі тысячам гараджан, а і жыхарам усёй краіны.

— Ці хапае на гэта высілкаў той каманды, якая запаўняе навінамі сайт Нацыянальнага гістарычнага музея — http://www.histmuseum.by?

— Так, сайт, электронныя камунікацыі — гэта вельмі важна. Мы актыўна працуем у сацыяльных сетках. Вось і сёння на планёрцы звярталіся да тэмы інтэрнэт-суправаджэння нашай паўсядзённай работы, шырэйшага інфармавання пра новыя выстаўкі. Ёсць у нас, як я лічу, унікальная экспазіцыя — «Беларусь XVI—XVIII стагоддзяў у партрэтах і геральдыцы». Так шырока гэтая тэма нідзе не адлюстравана. І, зразумела, шмат хто з аматараў гісторыі да яе не дайшоў. Не ведаюць пра такое багацце інфармацыі, пра магчымасць шмат цікавага ўбачыць на ўласныя вочы. Значыць, патрэбна пра яе пісаць сістэмна — і ў друкаваных медыя, і ў сацыяльных сетках. Патрэбны і добры альбом на гэтую тэму. Такія крокі — гэта яшчэ і доказ таго, што Беларусь гістарычна багатая, што ў нас захавалася шмат красамоўных артэфактаў, якія ўзвышаюць нашу нацыю, нашу краіну.

Дарэчы, навідавоку, што Нацыянальны гістарычны музей актыўна займаецца выдавецкай дзейнасцю... І гэта ў апошні час падштурхоўвае нас да своеасаблівай «рэвізіі» ўласных фондаў, уласных збораў. Мы не проста выпускаем альбомы. Хоць маем і досыць сімпатычны вялікі альбом, які распавядае пра нашу музейную ўвогуле. Зусім нядаўна выдалі ў «Беларускай Энцыклапедыі імя Петfigура Броўкі» альбом «І рай, і боль на Песенная Зямлі... Беларусь вачыма мастакоў 1920—1930-х гадоў». Кніга і зроблена шыкоўна, і рэпрадукцыі работ з нашай мастацкай калекцыі, сабраныя разам — усё гэта не можа не прыцягваць увагу. Важна толькі, каб і пра саму кнігу, і следам пра тое, што гэтыя скарбы захоўваюцца менавіта ў Нацыянальным гістарычным, шмат хто даведаўся. Адных прэзентацый з нагоды выдання альбома, відаць, мала.

— Чаму б не паказаць альбом у віртуальнай прасторы?

— Сапраўды, гэта добрая ідэя. І мы, пэўна, сумесна з «Беларускай Энцыклапедыяй» наладзім такі віртуальны прагляд. Створым магчымасці віртуальна пагартаць старонкі выдання, пазнаёміцца з адметнымі выявамі нашых прашчураў.

Нядаўна мы пачалі выдаваць штоквартальны часопіс «Беларускі музей». Выйшла ўжо два выпускі. Спадзяёмся на добрае жыццё гэтага медыйнага праекта. І верым, што часопіс таксама будзе адным са складнікаў аб'яднання музейнай грамадскасці.

Гутарыў Мікола РАЎНАПОЛЬСКІ.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

Калектыў «Звязды» глыбока смуткуе з нагоды смерці беларускага гісторыка, кандыдата гістарычных навук, нашага аўтара Уладзіміра Іванавіча АДАМУШКІ і выказвае шчырыя спачуванні родным і блізкім нябожчыка.

Віншуем!

Дзеці — яго зямны лёс

Вядомаму расійскаму пісьменніку, актыўнаму грамадскаму дзеячу Альберту ЛІХАНАВУ 13 верасня спаўняецца 85 гадоў.

Юбілей слыннага Чалавека адзначаюць удзячныя чытачы, педагогі, бацькі і ў Беларусі. Чаму? Таму, што кнігі Альберта Ліханава ёсць ці не ва ўсіх нашых бібліятэках, уключаючы і сямейныя зборы найбольш запатрабаваных літаратуры.

Звыш сотні кніг А. Ліханава выйшлі на розных замежных мовах. Я асабіста пераклаў на беларускую мову кіраўніцтвыя аповесці «Дзяўчынка Усёадно» і «Мамчын сынок». А мінская школьніца Оля Кулюкіна стала пераможцай міжнароднага конкурсу «Чытаем Альберта Ліханава». У Маскве з рук пісьменніка Оля атрымала збор яго твораў. Журналістам патлумачыла: «Аднойчы мама прынесла з кнігарні раман Альберта Анатолевіча «Зламаная лялька». Я чытала яго ўсю ноч, не магла адарвацца. Пасля прачытала раман «Ніхто», аповесць «Ляжачых не б'юць», «Рускія хлопчыкі»...»

Да ацэнкі кніг Альберта Ліханава маглі б далучыцца тысячы беларускіх школьнікаў. А яшчэ многія беларускія дзеці, якія ведаюць, што такое хваробы, інваліднасць, сіроцтва, маглі б расказаць, які Альберт Анатолевіч нястомны дабрачыннік, верны сябар дзяцей, у нечым пакрыўджаных лёсам. Пра свайго расійскага сябра за ўсіх іх скажу я.

З Альбертам Анатолевічам мы разам працуем на ніве дзіцячых фондаў ужо больш за трыццаць гадоў. Савецкі дзіцячы фонд стварыў некалі ён. Пазней мы, дзетфондаўцы былых савецкіх рэспублік, аб'ядналіся ў Міжнародную асацыяцыю дзіцячых фондаў. Разам праводзім валанцёрскія з'езды, пленумы, сходы, на якіх абменьваемся вопытам дабрачынных справы, падтрымліваем адзін аднаго, мабілізуем агульныя намаганні па дапамозе нашым падапечным.

Прывяду адзін прыклад. Калі здарылася чарнобыльская бяда, Альберт Анатолевіч Ліханаў адзін з першых прыехаў у Беларусь. Ён здолеў знайсці спонсара, каб закупіць для дзіцячага цэнтра рэабілітацыі патрэбныя медпрыборы. Арганізаваў ваенныя транспартныя самалёты для вываскі на адпачынак і лячэнне дзяцей Беларусі ў пятнацаць краін свету. За сваё бескарыслівае служэнне дзецям, асабісты ўклад у духоўнае, маральнае выхаванне нашых спадчыннікаў Альберт Ліханаў узнагароджаны Ордэнам Францыска Скарыны.

Пра ўзнагароды пісьменніка, акадэміка Расійскай акадэміі адукацыі, ганаровага прафесара ўніверсітэтаў Кірава, Белграда, Свярдлоўска, Цюмені, Санкт-Пецярбурга, Сока (Японія) можна было б распавядаць вельмі доўга. Скажу толькі, што імя Альберта Ліханава ўнесена ў спіс выдатных еўрапейцаў XXI стагоддзя.

Альберт Ліханаў стаяў ля вытокаў распрацоўкі і прыняцця Канвенцыі аб правах дзіцяці ў ААН. Гарача падтрымліваў прыняцце ў Беларусі закона «Аб правах дзіцяці». Таксама Альберт Анатолевіч не адзін раз бываў на пленумах Беларускага дзіцячага фонду, у паездках па нашых школах-інтэрнатах, сямейных дзіцячых дамах. Быць побач з ім, слухаць яго вобразныя, глыбокія прамовы — і духоўны ўрок, і асалода ад глыбокіх думак, вобразнай мовы.

У дзень юбілею хочацца пажадаць Альберту Анатолевічу Ліханаву моцнага здароўя, невычарпальнага натхнення для добрых спраў, новых літаратурных твораў для ўдзячных чытачоў. Жыццё, як вучыў Леў Талстой, вымяраецца не гадамі, а чалавечнасцю. Дык хай жа паходня чалавечнасці, запаленая і для яго самога, і для мільёнаў дзіцячых душ, будзе нязгасная.

Уладзімір ЛІПСКІ,
лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, старшыня праўлення Беларускага дзіцячага фонду, член Прэзідыума Міжнародная асацыяцыі дзіцячых фондаў.

Слова — чытачам «Звязды»

Валерый МАЛАШКА:

«ЗАЎСЁДЫ ХОЧАЦЦА АНАЛІТЫКІ І ГРУНТОЎНАСЦІ»

— А палове шостай раніцы я ўжо адкрываю навіны на сваім мабільніку і чытаю, што адбылося ў краіне, свеце. Газеты я часцей за ўсё прагортваю. Яны не могуць канкурыраваць з інтэрнэт-выданнямі ні па наспеўнасці, ні па аператыўнасці.

Мне падабаецца, што ў «Звяздзе» ў кожным нумары даецца цытата на першай старонцы. Можна даведацца, што чалавек думае, як ён рэагуе на тую ці іншую палітычную сітуацыю.

Мне цяжка разважаць пра адну газету, прасцей сказаць, што мяне прыцягвае ў перыёдыцы. Заўсёды вабіць палярнасць меркаванняў, розныя погляды на адну і тую ж сітуацыю. Цікавыя і літаратура, і мастацтва, і нацыянальныя пытанні, і рэлігійныя. І каб там было не проста, умоўна кажучы, пра Вялікдзень і тое, як трэба булкі пячы, а прысутнічала і нейкае асэнсаванне падзеі. Хочацца сур'ёзнасці, аналітыкі, грунтоўнасці. І не трэба саромецца паўтарацца. У кожнага часу свае словы, свой настрой, свае эмоцыі і ўспрыманне рэчаіснасці.

Мне цікавыя матэрыялы з медыйнымі асобамі, палітолагамі, кіраўнікамі вядомых арганізацый і прадпрыемстваў. Такое будзеш чытаць, як той казаў, ад вокладкі да вокладкі. Хочацца ведаць, што адбываецца ў нас, у Амерыцы, ва ўсім свеце, што думаюць пра нас беларусы замежжа, чым наогул яны жывуць у чужой для сябе краіне.

Апошнім часам у выданнях стала шмат розных фотаздымкаў з адных і тых жа мерапрыемстваў. Паглядзеў, і ўсё зразумела, што адбываецца, нават не трэба ўчытвацца ў тэкст. А вось часу не хапае, дык гэта фінансавай аналітыкі, біржавых пытанняў. Ёсць цэлы пласт людзей, маладых, дарэчы, якім гэта не проста цікава, а неабходна, бо гэта іх работа. Без гэтага сёння не можа абысціся ні адна сур'ёзная газета. Мы ўсе разумеем, што толькі пры наяўнасці якаснага і запатрабаванага кантэнту газета мае шанц супрацьстаяць усім гэтым тэлеграм-каналам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Спадчына

ДРУГОЕ НАРАДЖЭННЕ ХРАМА

Мінскі Свята-Аляксандра-Неўскі храм — адзін з нешматлікіх помнікаў архітэктуры сталіцы, які захаваўся да нашых дзён у першародным выглядзе. Царква выстаяла ў вайну, у эпоху ваяўнічага атэізму і з 1898 года практычна ніколі не была зачынена для вернікаў. Сёння храм перажывае рэканструкцыю. Будаўнічыя работы вядуцца ў перапынках паміж набажэнствамі — царква на Вайсковых могілках не закрывае свае дзверы для прыхаджан нават «на рамонт».

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ

Сёння храм у імя святога благавернага вялікага князя Аляксандра Неўскага знаходзіцца ў цэнтры Мінска. А калісьці тут была ўскраіна. Вайсковыя могілкі, пасярод якіх стаіць царква, ўзніклі крыху раней. Паблізу, за паўкіламетра ад месца будучага храма, знаходзіўся ваенны шпіталь, і калі паўстала пытанне, дзе хаваць салдат і афіцэраў, якіх медыкі не здолелі выратаваць, гарадскія ўлады выдзялілі ўчастак у прадмесці Доўгі Брод.

Храм побач з вайсковымі могілкамі быў асвечаны ў 1898 годзе ў памяць загінулых на полі бітвы падчас руска-турэцкай вайны. З яго будаўніцтвам звязана легенда. Справа ў тым, што ўзводзілася царква не толькі на сродкі з гарадскога бюджэту, але і на ахвяраванні. Грошы ўносілі сваякі загінулых салдат і афіцэраў, і 20 000 рублёў на пабудову храма ўнесла Марыя Кекскольмская. Паводле легенды, падчас ваенных дзеянняў рускія салдаты (сярод якіх, зрэшты, былі прадстаўлены практычна ўсе нацыянальнасці, якія ўваходзілі ў Расійскую імперыю XIX стагоддзя) падабралі маленькую дзяўчынку, турэцкую сірату. Дзіця стала «дачкой палка», хрысцілі яе Марыяй. А калі дзяўчына вырасла, то засталася жыць на свайго новай радзіме. Як яна апынулася ў Мінску, легенда замоўчвае.

— Гэта не больш чым паданне, — кажа **настаяцель храма протаіерэй Мікалай КОРЖЫЧ.** — Гістарычных дакументаў, якія пацвярджаюць яго, мы не знайшлі. Дакладна тое, што храм будаваўся як помнік воінам, якія аддалі сваё жыццё ў руска-турэцкай вайне 1877-1878 гадоў. Пра гэта нагадваюць дзве мемарыяльныя дошкі, уманціраваныя ў цэнтральны неф. На іх выгравіраваны імёны 118 воінаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га пяхотнага Каломенскага палка, якія загінулі пры ўзяцці Плеўны і Балгары. Сярод гэтых людзей ёсць і выхадцы з нашай беларускай зямлі — гэта відаць нават па прозвішчах: Мастовіч, Ананіч, Сачук...

Каля храма таксама размешчаны пахаванні герояў Плеўны: генерал-лейтэнанта Жыржынскага, генерал-маёра Бырдзіна, падпалкоўнікаў Дехцярова, Жажэра і Абрамава. Гэта першыя магілы на Ваенных могілках, а на сённяшні дзень старажытны некропаль налічвае каля сямі тысяч пахаванняў.

Будаўніцтва мінскага Свята-Аляксандра-Неўскага храма распачалося вясной 1896 года і завяршылася за два гады да надыходу бурнага дваццатага стагоддзя. Будынак спалучаў у сабе рысы ўзорачча і рускага барока, яго архітэктарам быў Віктар Струеў, які пазней атрымаў вядомасць дзякуючы праектам цэркваў у Зэмбіне, Лунінцы, Любчы, Барысаве.

— Спачатку была пабудаваная цэнтральная частка храма, бакавыя памяшканні прыбудоваліся крыху пазней, — тлумачыць айцец Мікалай. — Па завяршэнні ўсіх работ царква стала пяціглавай. Яна была багата ўпрыгожана фасадным дэкорам і шматлікімі мазаікамі. І ўнутранае ўбранне, і знешні выгляд царквы былі тыповыя для таго часу: так будавалі праваслаўныя храмы ў XIX стагоддзі.

У першыя гады савецкай улады царква Аляксандра Неўскага цудам пазбегла знішчэння. Яна была адзіным дзеючым праваслаўным храмам у сталіцы БССР аж да 1938 года, калі органы НКВД арыштавалі яе настаяцеля, а на дзверы павесілі замок.

— І тады прыхаджане сталі збірацца на ганку храма, — расказвае сураэмоўнік. — Людзі маліліся і падтрымлівалі адно аднаго.

Неверагодна, але ў 30-я гады храм пазбег рабавання. Сёе-тое, вядома, знікла, але старажытная цудатворная ікона Мінскай Маці Божай захавалася да нашых дзён. Як і драўляная перанасная цэркаўка, якой карыстаўся Каломенскі полк для малітваў падчас ваенных дзеянняў у Турцыі. Зараз цэркаўку ўбачыць нельга, яна знаходзіцца на рэканструкцыі. Але пасля завяршэння будаўнічых работ гэты раритэт зойме годнае месца ў абноўленым храме — у левым куце будынка, дзе яна стаяла заўсёды.

Ваеннае ліхалецце не зраўняла храм з зямлёй. Падчас бамбёжак цэнтральны купал прабіла фугасная бомба, але не выбухнула. Выбуховай хваляй ад іншага снарада быў сарваны галоўны купал, а пажар паколасці. Гаворым па тэлефоне па два, тры разы на дзень, ад 20 да 30 рублёў у месяц нагаворваю, але ж на гэтым не эканомім...

Сястра мая яшчэ паспела ў пачатковую школу, якая была ў вёсцы, а калі мне час прыйшоў, ужо школы не было, давялося ісці ў сямігодку за тры кіламетры адсюль. Сярэдняя школа была яшчэ далей, таму пасля сямі класаў пайшла працаваць у калгас, была і цялятніцай, і сіваркай, потым даяркай дваццаць гадоў. Ферма за тры кіламетры, даілі тры разы, спачатку яшчэ рукамі. Уставаць на раніцу ў пяць гадзіны, ісці і ў непагадзь, і ў завею, дзе

Самыя знакамітыя пахаванні Вайсковых могілак — магілы Купалы і Коласа.

— Пад храмам знаходзілася памяшканне для печаў. Цяпер, калі неабходнасць у пячным ацяпленні адпала, мы выкарыстоўваем іх для гаспадарчых патрэб. А ў гады вайны тут мінчане — і вернікі, і атэісты — хавалися ад бамбёжак, — кажа сураэмоўнік.

Адразу пасля акупацыі Беларусі нямецка-фашысцкімі захопнікамі пачалі адкрывацца цэрквы. І ў храме Аляксандра Неўскага аднавілося службы. З тых часоў царква не закрывалася. У 1950—1980-я гады яна была адным з двух дзеючых у Мінску праваслаўных храмаў. Другі быў кафедральны Свята-Духаў сабор.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ НА АХВЯРАВАННІ?

Першыя аднаўленчыя работы былі пачаты ў будынку храма ў 1982 годзе. Да 1983 года рэстаўратары аднавілі цэнтральны купал і крыжы, пазалацілі купалы, пафарбавалі сцены. У 1985 годзе ўнутры храма былі адноўленыя насценныя роспісы і зноў распісаны купал. Многія карэнныя мінчане памятаюць гэтыя роспісы. Сёння іх ужо не ўбачыш. Сцены храма будуць распісаны нанова, захаваюцца толькі першапачатковыя сюжэты фрэсак.

«Запусценне — спадчына савецкіх часоў: раз няма вечнага жыцця, значыць, і да могілак можна ставіцца проста як да ўтылізатара».

— Якасць выканання роспісу ў савецкія часы вымагала жадаць лепшага, — адзначае протаіерэй Мікалай Коржыч. — Царкоўнаму мастацтву тады не вучылі, таму ўсё рабілася на энтузіязме. Гэта быў тая званы трафарэтны роспіс, які мала адпавядае задуме будаўнікоў храма. Цяпер плануецца вярнуць першапачатковае аблічча храма — унутры і звонку. На жаль, фатаграфій унутранага ўбранства гэтага храма канца пазамінулага стагоддзя не захавалася. Але захаваліся ўзоры падобных праваслаўных храмаў XIX стагоддзя ў Маскве і Санкт-Пецярбургу. На іх і абапіраецца навуковае кіраўніцтва рэканструкцыі.

Дах царквы быў абноўлены ў 2015 годзе на ахвяраванні юрыдычных і фізічных асоб. Званіца — яшчэ ранейшая. Да стагоддзя юбілею храма, у 1998 годзе: унутры яе ўсталявалі шэсць новых званоў. У 2018 годзе была рэстаўрыравана маленькая хрысцільная царква, пабудаваная каля храма ў 1991-м.

Зараз работы вядуцца ўнутры храма Аляксандра Неўскага: акарама роспісу сцен і купала засталося завяршыць пакрыццё падлогі каменнымі плітамі і аздабленне натуральным каменем панэляў, тлумачыць сураэмоўнік. Цэнтральная частка іканастаса пакуль знаходзіцца на рэстаўрацыі. Завершацца работы абнаўленнем асвятляльных элементаў — панікадзіл, бра, царкоўных люстраў.

Айцец Мікалай кажа і пра неабходнасць добраўпарадкавання Ваенных могілак, якія акружаюць храм. Старадаўнія могілкі па ўсім свеце даўно ўжо сталі турыстычнымі аб'ектамі. Ёсць турыстычны пацыянтар і ў аднаго з дзвюх самых старых некропаляў у межах Мінска (разам з Кальварыйскім). Афіцыйна Вайсковыя могілкі былі закрытыя для пахаванняў у 1959 годзе. Але яшчэ ў савецкія гады тут у асноўным хавалі знакамітасцяў і членаў іх сем'яў — дзеячаў культуры і мастацтва, заслужаных работнікаў навукі. Самыя знакамітыя пахаванні Ваенных могілак — Янкі Купалы і Якуба Коласа, яны размешчаны ў паўночнай частцы некропаля, непадалёк ад пахаванняў воінаў-вызваліцеляў Мінска, загінулых у 1944-м. На Вайсковых могілках знайшлі апошні прытулак пісьменнікі і паэты — цвет беларускай літаратуры савецкага перыяду. Заснавальнікі Купалаўскага тэатра Уладзімір Крыловіч і Еўсцігней Міровіч. Навуковец, які стаіў каля вытокаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, — акадэмік Усевалад Ігнатоўскі. Супрацоўніца ААН Рут Уолер, якая працавала ў складзе місіі, што дапамагала адноўленню Беларусь пасля Вялікай Айчыннай вайны.

На добраўпарадкаванне Вайсковых могілак не так даўно грошы выдзялялі горад, і невялікая частка некропаля ўжо прыведзена ў парадак. Але значная плошча пакуль знаходзіцца ў запусценні.

— Нядаўна хацеў падысці да магілы Кузьмы Чорнага — ледзь не параніў сабе нагу, — наракае айцец Мікалай. — Гэтае запусценне — спадчына савецкіх часоў: раз няма вечнага жыцця, значыць, і да могілак можна ставіцца проста як да ўтылізатара. З сямі тысяч пахаванняў тры з паловай на сённяшні дзень не ідэнтыфікаваныя.

Святар спадзяецца, што з часам і храм, і некропаль будуць адноўлены ў комплексе — так, каб засталіся задаволеныя і гістарыкі, і прадстаўнікі сферы культуры, і прыхаджане.

Калі будзе завершана рэканструкцыя, настаяцель храма адказаць пакуль не можа. Справа ў тым, што работы вядуцца на ахвяраванні. І нядаўна святар звярнуўся з просьбай аб садзейнічанні ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі.

— Сродкі на рэканструкцыю храма ўжо выдзеленыя з рэспубліканскага бюджэту, але да цяперашняга часу не вызначаны заказчык рамонтна-рэстаўрацыйных работ, не забяспечана распрацоўка навукова-праектнай і каштарысной дакументацыі па аб'екце, — кажа Мікалай Коржыч.

Пытанне ўзята на кантроль Саветам Рэспублікі. Ёсць надзея, што ў найбліжэйшы час яно будзе вырашана, і ідэзін з дзвюх помнікаў дарэвалюцыйнага праваслаўнага дойлідства, што захаваліся ў беларускай сталіцы, здабудзе другое нараджэнне.

Дзіяна РОНІНА.



Значная тэрыторыя некропаля патрабуе сур'ёзных укладанняў — і грошай, і намаганняў.

Храм Аляксандра Неўскага — помнік дарэвалюцыйнага праваслаўнага дойлідства, што захаваўся ў нязменным выглядзе, перажыўшы вайну і эпоху ваяўнічага атэізму.

Уладзімір ДРАЖЫН, старшыня папячыцельскага савета царквы Аляксандра Неўскага:

— У 2014 годзе, калі я вярнуўся з працы Надзвычайным і Паўнамоцным паслом Рэспублікі Беларусь у Літве і Фінляндыі, мяне запрасіў Уладзіка Філарэт на сустрэчу і запрапанаваў узяцца за рэканструкцыю храма Аляксандра Неўскага, які размешчаны на Ваенных могілках. Я пагадзіўся і вось з 2014 года сістэмна займаюся гэтай справай, у тым ліку пошукам сродкаў як спонсарскіх, так і дзяржаўных. На сённяшні дзень мы ўжо ўключаны ў дзяржаўную інвестыцыйную праграмму на 2020-2021 гады, нам удалося сабрацьгрошы ад спонсараў. Кожны год мы знаходзім да 200 000 беларускіх рублёў. І там ужо шмат зроблена на сённяшні дзень, напрыклад, пераркпты дах, заменены званы на званніцы, заменены вокны і дзверы, зроблены цеплаўзел, капітальна адрамантаваны прыхадскі дом з хрысцільным храмам і дзве часоўні, заменены ацяпленне, праводка, ператкнаваны сцены і столі ды многае іншае. А цяпер там працягваюць працу рэстаўратары і будаўнікі, кладуць гранітную падлогу. Потым пойдзе новы этап, які дапаможа распачаць роспіс інтэр'ераў і тыя работы, якія яшчэ чакаюць свайго часу. Я штомесяца праводжу там пасяджэнне нашага аляксандрыйскага савета і лічу, што гэтую справу мы зробім, бо ў верасні 2021 года спаўняецца 800 гадоў з дня нараджэння князя Аляксандра Неўскага, збіральніка славянскіх земляў. У Расіі выдалі ўказ, дзе акрэслена ўсё, што трэба зрабіць да гэтай вялікай даты. І мы таксама павінны не заставацца ўбаку, таму што царква Аляксандра Неўскага ў Мінску – гэта самы старэйшы храм. У гады вайны там мелі прытулак яўрэі і беларусы, якіх хацелі ў якасці палонных адправіць у Германію. Але немцы мелі такую асаблівасць, што на акупаваных тэрыторыях яны ў храмы не ўваходзілі. Дзякуючы гэтаму там шмат людзей уратаваліся. І цяпер у крыпце ўстаноўлена мемерыяльная дошка, якая нагадвае пра тыя падзеі. Шмат зроблена, але, спадзяюся, нам дазволяць гэтую справу давесці да добрага выніку.

МЕСЦА СІЛЫ ДВУХ ДЭПУТАТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Партызанаў у нас, вядома, не знайшлі, чалець не сталі, але забралі карову і свінёй. Цяпер нават і не ведаю, як бацькі выкруціліся, каб усе выжылі, з голаду не паўміралі, нас жа было ў іх сямёра...

Пра тую аблаву згадаў аднавясковец Соф'і Уладзіміраўны Міхаіл Пігас. Міхаілу Яўгенавічу расказвала бабуля. Усё пачалося з інцыдэнту ў суседніх Чарневічах, партызаны там забілі немца. Вось і сталі акупанты праводзіць «зачыстку». Некалькі чалавек тады забілі і ў Пузях. А яго бабуля з малымі дзецьмі, як і многія іх суседзі, схаваліся ў балоце, былі там некалькі сутак. Без ежы, вады сядзелі ў такой мясціне, куды і жывёла хадзіць баялася, там расла асаблівая пякучая асака, скуру разразала. Сядзелі, колькі вытрывалі, потым вылезлі. Чые хаты спалілі, тыя сем'і зімавалі ў хляве, што застаўся ад пажару. Цяжка нават уявіць, чаго нацярпеліся нашы людзі ў вайну — падсумоўваем з Міхаілам Яўгенавічам.

Соф'я МІКІЦІЧ.

На сваім і калгасным

— Вайна скончылася, сталі ўладкоўваць жыццё, — расказвае Соф'я Мікіціч, карову на час даў сваяк. Было сваё поле, араліся, сеялі. Потым хто маладзейшы, сталі выязджаць на заробкі ва Украіну.

Соф'я таксама ездзіла, там зямля ўрадлівая, зарабіла для сям'і пшаніцы, трохі грошай, амаль усе аднавяскоўцы пабывалі ў канцы 40-х у суседняй рэспубліцы. А ў 1950 годзе арганізавалі калгас, сталі працаваць там. Яны з мужам таксама працавалі ў калектыўнай гаспадарцы. Цяпер з Соф'яй Уладзіміраўнай жыве дачка, бо адна яна ўжо не можа, ногі амаль зусім адказалі. Але аптымізму бабуля не траціць, тэлевізар не глядзіць, вочы хворыя, слухае перадачы з задавальненнем.

Соф'я Мікіціч, як ужо гаварылася, жыве на хутары, а на самым пачатку вёскі хата Ганны Вішнеўскай. Ганна Аляксандраўна перабірала бульбу.

— Прыехалі дзеці, дзве гадзіны пакапалі і ўсю бульбу выбралі, — гаворыць гаспадыня.

